**Матузенка А.С.**

# ВЯСЕЛЬНЫ АБРАД ЯК ФОРМА ПЕРАДАЧЫ НАРОДНЫХ ТРАДЫЦЫЙ СУЧАСНАЙ МОЛАДЗІ

Народная педагогіка беларусаў была педагогікай жыцця. Выхаваўчая практыка на працягу многіх стагоддзяў, пачынаючыся з калыскі, была шчыльна звязана з жыццём, побытам, гаспадарчай дзейнасцю народа, абапіралася на яго жыццёвыя прынцымы. Найбольш цікавыя і карыстныя звесткі па народнай педагогіцы беларусаў можна знайсці ў вуснай народнай творчасці, звычаях абрадах, дзіцячых гульнях, аналіз якіх дае магчымасць разгледзець асноўныя праблемы этнапедагогікі і праблемы сямейнага выхавання моладзі.

Народная педагогіка з упэўненасцю сцвярджае, што дзеці павінны выхоўвацца і расці ў сям'і, якая стварае найлепшыя для гэтага ўмовы.

Культурнае асяроддзе сям'і ўдзельнічае на фарміраванне каштоўнасцей кожнага яе члена ( этнічную свядомасць, мову, нормы паводзін, звычаі , абрады). З рэальнай дзейнасцю самой сям'і звязаны такія праблемы, як сацыялізацыя і падрыхтоўка дзяцей да жыцця. Такім чынам, сям'я ў беларусаў, як найбольш устойлівая сацыяльная агульнасць, выконвае роль лідэра ў выхаванні, сацыялізацыі дзяцей і перадачы ім этнакультурных традыцый, якія яна захоўвала. На жаль, сам механізм трансмісіі гэтых традыцый вувучыны недастаткова. Увогуле традыцыйнымі былі непарушальны аўтарытэт і павага да бацькоў, да іншых членаў рода, любоў да дзяцей і адданасць справе іх выхавання [2, с.45] .

Народная педагогіка беларусаў, дзе адным з асноўных фактараў выступае выхаванне ў сям'і, абавязкам бацькоў лічыць стварэнне ўмоў для фарміравання дзяцей, падрыхтоўкі іх да жыцця. “ Умеў нарадзіць – сумей і вывучыць”. Больш таго, народ упэўнены, і не без падставы, што ад таго, якая сям'я, які ў ёй мікраклімат, як паводзяць сябе бацькі і іншыя члены сям'і, залежыць выхаванне дзіцяці ( “ Як добрае семя, дык добрае племя”, “ Па роду і куры чубатыя”). Такім чынвм, выхоўвае дзяцей ўвесь лад жыцця, быт і прыклад старэйшых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важнейшым педагагічным фактарам беларусы лічылі прыклад бацькоў. Яны павінны перадаць дзецям усё лепшае ў сабе і быць добрым прыкладам маральных паводзін. Дзеці вучыліся, гледзячы на старэйшых, і ўпітвалі кодэкс сялянская маралі. Беларускі этнограф А.Я. Багдановіч, які займаўся вывучэннем народнай педагогікі сям'і, падкрэсліваў, што народ цвёрда ўсведамляў ролю выхавання як фактару, што ўплываў на развіццё розуму і маральнасці, волі і характару, і важную ролю бацькоў у выхаваўчым працэссе [2,с. 68].

Звяртаючыся да народнай педагогікі можна выхаваць сучасную моладзі і яе адноміны да сямы, бацькоў і да роднага мястэчка. Разгледзім адно з такіх мястэчак і паглядзім на працу жыхароў па фармаванню сямейных адносін сучаснай моладзі падчас беларускага вяселля.

Горад Сянно, што находзіцца ў Віцебскай вобласці багат цудоўнымі мясцінамі і сваімі знакамітымі жыхарамі такія як Машэраў, Азгур і г.д. У гэтым горадзе шмат помнікаў архіялагічнай культуры, адным з якіх з'яўляецца будынак былой земскай управы – помнік архітэктуры пач. XXст ў якім зараз размешчаны Сенненскі гісторыка-краязнаўчы музей. Музей працуе над рознымі выставамі, якія кожны месяц наведваюць жыхары горада. Маё ўражанне захапіла адна з выстаў " Беларускае вяселле". У яе ўваходзілі такія экспанаты як хлебная дзяжа, фотаздымкі вяселляў, розныя ручнікі, лава, куфар, чырвоны вугал, вясельнае адзенне для маладога і маладой і шмат іншага.

Да нядаўняга часу дзяржаўная рэгістрацыя заключэння шлюбу ладзілася па тыповым сцэнарыі, абавязковым элементам якога было прывітанне маладых, подпісы ў кнізе рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, абмен абручальнамі пярсцёнкамі, уручэнне пасведчанняў аб заключэнні шлюбу і віншавальныя словы. Нягледзячы на тое, што ў ЗАГСах заўсёды выкарыстоўвалі элементы беларускіз вясельных традыцый і абрадаў, напрыклад, ручнік, як сімвал доўгага і шчаслівага жыцця( на ручнік ступіць – век ў згодзе быць), зерне пшаніцы, як сімвал багацця( у ім маладыя шукалі пярсцёнкі, каб потым заручыцца імі,пазбегнуць налёту

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

афецыйнасці не ўдавалася. З цягам часу змяніліся, пашыраліся патрабаванні грамадзян. Сучасная моладзь хацела б, каб рэгістрацыя шлюбу была асаблівай, адрознівалася ад рэгістрацый і ншых пар , праходзіла з асаблівасцямі мясцовага традыцыйнага абраду.

Ідучы насустрач пажаданням грамадзян, Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь прыняло пастанову аб магчымасці рэгістрацыі шлюбаў ва ўрачыстай абстаноўцы па індывідуальным сцэнарыі, распрацаваным з улікам пажаданняў маладых і іх бацькоў.

Гэта пастанова стала штуршком да распрацоўкі вясельнага абрада, які будзе праходзіць ў Сенненскім гісторыка-краязнаўчым музее. Па распрацаванаму сцэнарыю, які ўключаў у сабе элементы беларускага народнага вясельнага абрада, перад рэгістрацыяй шлюбу маладых сустракаў мастацкі калектыў “ Беларускія Шчадроўкі” і з песнямі, гульнямі суправаджаў да рэгістрацыі. Пасля рэгістрацыі, якая адбылася ў першай зале, маладых зноў сустракалі “ Беларускія Шчадроўкі”, пелі песні, варажылі на будачае жыццё маладым, гулялі са сватамі і ўсталёўвалі вясельную браму.

Мастацкі калектыў “Беларускія Шчадроўкі” быў створаны мною адмыслова для вясельнага абраду і ўрачыстай рэгістрацыі шлюбу.Назва калектыва была абраная не выпадкова, а па назве першых каляд – першай куцці, яе таксама называлі багатай куццёй і шчодрым вечарам. У шчодры вечар па беларускіх сёлах ( як і ў іншых суседніх народаў) шчадравалі. Дзяўчаты хадзілі са Шчодрай. На гэтую ролю выбіралі прыгожую, статную дзяўчыну. Яе адзявалі ў святочнае адзенне, галаву ўпрыгожвалі вянком з папяровых кветак і рознакаляровымі стужкамі. Адзеўшы Шчодру, дзяўчаты адпраўляліся па хатах і спявалі песні. Пры абыходзе дамоў аднавяскоўцаў дзяўчаты стараліся не абысці хаты, у якой жыў малады нежанаты хлопец. Часам пры велічанні хлопца ў той частцы песні, дзе спявалася пра будучую нявесту, называлася імя дзяўчыны, якая ( як было вядома) па сэрдцу хлопцу ці па нораву яго бацькам. У апошнім выпадку ўзнагарода была асабліва шчодрай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Справа калектыва на вясельным абрадзе не сканчаецца. “ Беларускія Шчадроўкі” выступаюць на ўсіх святах беларускага народнага каляндара, такіх як купалле, зажынкі, дажынкі, каляда, масленка і інш.

Сцэнарый вясельнага абрада быў распрацаваны пасля таго, як поўнасцю пазнала традыцыйнае беларускае вяселле , а ў прыватнасці вяселле на Віцебшчыне і вяселле горада Сянно. Дзеля гэтага была праведзена размова з месных этнографамі: Жаўтабрухавай Б.Б., Пядачкінай П.С., Бандарэвічам В.В.. Таксама мною былі вывучаны матэрыялы фальклорнага багацця Сенненшчыны, якія збірала фальклярыстка, кіраўнік ансамбляў “ Вясёлыя музыкі”, “ Вечарынка” Дарожкіна О.С..

Кожнаму дзейству, якое ўваходзіла ў вясельны абрад, надавалася магічнае значэнне. На працягу доўгіх стагодзяў нашы продкі прыкмячалі, што і як трэба рабіць, каб жыццё новай сям’і было ладным ды складным. Да татога каштоўнага вопыту варта звяртацца і сёння.

Выстава, вакол якой праходзіць абрад стала папаўняецца. Большую частку выставы займаюць старыя фотаздымкі, якія сталі дакументальнымі зведкамі абрадаў. “ Вясельная мода XX стагоддзя” – прынамсці так можна абазначыць гэтую фотагалерэю. На асобных кадрах зафіксаваны і выключныя моманты: развітанне дзяўчыны з бацькоўскім домам, выпяканне вясельнага каравая, вясельны “ поезд”. Побач з пажаўцелымі ад часу фотаздымкамі на выставе размясціліся і сучасныя здымкі беларускага шлюбнпга абраду, рэканструяванага ўдзельнікамі этнаграфічнага таварыства.

Цэнтральнае месца выставачнай залы займае вясельны пакой. Ў ім можна пабачыць святочную атрыбутыку: вясельныя строі, куфар з пасагам, традыцыйныя музычныя інструменты, элементы абрадавага адзення і інш.

Кожная з вясельнай атрыбутыкі прадстаўленай у выставе была выкарыстана ў самім абрадзе. Напрыклад дзежка, на якую садзілася маладая пасля таго, як госцейкі кідалі туды грошкі, ручнікі, якія былі спецыяльна сабраныя ў этнаграфічных экспедыцыях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Усе гэтыя элементы робяць вясельны абрад не падобным на простаю рэгістрацыю шлюбу у ЗАГСе. Народныя традыцыі беларускага вяселля паказваюць моладзі ( як асноўнай часткі гасцей на вяселлі) спадчыну якае каштуе вельмі шмат. Бацькі маладых і астатнія родзічы пераносяцца ў сваю маладосць, калі яшчэ не былі страчаны ўсе традыцыі вяселля.

Розныя госці навадвалі вяселле і з Украіны, і з Рассіі . Яны захапіліся традыцыямі Беларусі, а ў прыватнасці беларускага вяселля. Трэба адзначыць, што такая традыцыя праводзіць вясельны абрад існуе толькі некаторых мястэчках Беларусі.

Вясельны абрад – на Сенненскі лад існуе ўжо тры гады. За гэты час шмат пар зарэгістравалі свой шлюб па-беларуску і задаволены гэтым зыходзячы з індывідуальнай гутаркі з імі. Сучасная моладзь з павагай ставіцца да традыцый вясельнай абраднасці беларусі і пры рэгістрацыі шлюбу ўсё больш карыстаецца стылізаваным абрадам “ Вясельны абрад на Сенненскі лад”.

1. Абрады // Этнаграфія Беларусі: энцыкл. – Мн. : БелСэ,1989. – С. 14–15.

2. Беларусы. Т. 5. Сям’я / В.К. Бандарчык і інш. – Мн. : Бел.Навука, 2001. – 375 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ